*Аляксандр Коласаў (Чэрыкаў)*

# НОВЫЯ АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ПОМНІКІ ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЁНА МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Летам 2002 г. сіламі археалагічнага гуртка, створанага пры сярэдняй школе № 1 г. Чэрыкава, пад кіраўніцтвам аўтара на тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна праводзіліся даследванні помнікаў археалогіі на падставе дазволу Інстытута гісторыі НАН Беларусі па форме № 3 (№ 1402). У выніку было даследавана 55 археалагічных помнікаў, з іх — 33 новыя, раней невядомыя навуцы: 14 стаянак, 13 паселішчаў старажытнарускага часу і позняга сярэднявечча, чатыры адзіночныя курганы, яма для выпальвання вуголля і серпападобны вал. Тры археалагічныя аб'екты з прыведзенага спісу знойдзены на тэрыторыі Краснапольскага і Чавускага раёнаў.

У ваколіцах г. Чэрыкава на правых берагах р. Сож і р. Вудага было выяўлена шэсць стаянак каменнага і бронзавага вякоў, сем паселішчаў эпохі феадалізму.

Добрыя вынікі дало вывучэнне басейна р. Сянна ля в. Пільня (Вепрынскі сельскі савет). На левым беразе Сянны, пачынаючы з паўночна-заходняй ускраіны вёскі было выяўлена чатыры стаянкі каменнага і бронзавага вякоў, селішчы эпохі Старажытнай Русі, адзіночны курган (мал.1: 17—21).

Упершыню на тэрыторыі раёна, на правым беразе р. Сянна, за 1 км на паўночны ўсход ад в. Пільня, на паўднёвы ўсход ад лясной дарогі на вёску, выяўлена збудаванне для вытворчасці вугалю ( мал.1: 16).

На тэрыторыі Язерскага сельскага савета каля в. Прыпёчына, на правым і левым берагах р. Лабчанка знойдзены селішча і два адзіночныя курганы (мал.1: 12—14).

Падчас вывучэння ваколіц в. Рагаліна былі выяўлены фрагменты ляпной і ганчарнай керамікі, шкла зя-




*Мал. 1. Новыя помнікі археалогіі Чэрыкаўскага раёна (па матэрыялах 2002 г.):* 1 — Рэчыца, стаянка і селішча; 2 — Чэрыкаў, стаянка-1, селішча-2; 3 — Чэрыкаў, стаянка-6, селішча-5; 4 — Чэрыкаў, стаянка-8, селішча-6; 5 — Чэрыкаў, стаянка-7; 6 — Чэрыкаў, стаянка-4, паселішча позняга сярэднявечча (культурныя адклады горада); 7 — Чэрыкаў, селішча-1; 8 — Чэрыкаў, стаянка-5; 9 — Чэрыкаў, селішча-4; 10 — Чэрыкаў, селішча-3; 11 — Шыманы, серпапаобны вал; 12 — Прыпёчына, адзіночны курган-1; 13 — Прыпёчына, адзіночны курган-2; 14 — Прыпёчына, селішча; 15 — Рагаліна, стаянка і селішча; 16 — Пільня, вугляпальная яма; 17 — Пільня, стаянка і селішча-1; 18 — Пільня, стаянка і селішча-2; 19 — Пільня, стаянка і селішча-3; 20 — Пільня, стаянка-4; 21 — Пільня, адзіночны курган; 22 — Рудня, стаянка і селішча

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ленага колеру з паветранымі пузыркамі ўнутры, абломкі кальцынаваных костак. Таксама сабраны адшчэпы і пласціны, пласціны з рэтушшу, што сведчыць аб месцазнаходжанні каменнага веку (мал.1:*15*).

Даволі цікавае збудаванне — серпападобны вал — быў даследваны ля в. Шыманы (за 2 км на паўночны ўсход ад вёскі і 30 м на паўднёвы захад ад фермерскай гаспадаркі Марачкіна (мал.1: 11)).

Асаблівую ўвагу выклікаюць асобныя знаходкі, знойдзеныя на дне кар'ера, размешчанага на правым беразе р. Сож, за 2 км на паўднёвы захад ад в. Горкі. Сярод іх — абломак мусцьерападобнага скрэбла з крэмня жоўтага колеру, скрэблападобны выраб, скрабок, аднапляцовачны нуклеус.

Сярод вядомых помнікаў паўторна былі абследаваны стаянкі каменнага і бронзавага вякоў ля вв. Бакаў, Вохар, Вусце, Горкі, Гронаў, Мірагошч; гардзішча г. Чэрыкава; курганныя могільнікі Вохар (12 насыпаў), Горкі (9 насыпаў), Гронаў (74 насыпы), Ушакі (4 насыпы), Чэрыкаў (12 насыпаў), адзіночны курган ля в. Рэчыцы. Напрыклад, на стаянцы Вусце, якая размяшчаецца на правым беразе р. Сож, на паўднёва-заходняй ускраіне аднайменнай вёскі, былі вывучаны берагавыя агаленні. Культурныя адклады паселішча распаўсюджаны на глыбіні 0,2 — 0,5 м, на кантакце слою цёмна-шэрага колеру і пяску жоўтага колеру. Знаходкі прадстаўлены ў асноўным адшчэпамі і пласцінамі (асобныя артэфакты маюць рэтуш), аднапляцовачнымі нуклеусамі, скрабкамі, разцамі, скоблямі, рубячымі прыладамі, грубаляпной керамікай эпохі неаліту. Апошняя упрыгожвалася адбіткамі грэбня і ямкамі. Нажаль, большая частка месцазнаходжання разбурана кар'ерам, які ўтвараўся на месцы выбаркі крэйды. Гэта не адзінкавы прыклад такога абыякавага падыходу да захавання гісторыка-культурнай спадчыны ў Чэрыкаўскім р-не.

Такім чынам, матэрыялы новых археалагічных помнікаў значна пашыраюць нашы веды па старажытнай гісторыі Чэрыкаўскага Пасожжа.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова